Государственное учреждение культуры
«Пинская районная централизованная библиотечная система»

# Панорама библиотечной жизни




Пинск, 2 0 16





# ***Уважаемые коллеги и читатели!***

*В Беларуси 2016 год был объявлен Годом культуры. В библиотеках государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» этот год был плодотворным и насыщенным. Велась работа по популяризации творчества не только белорусских писателей, но и творчества местных авторов, а также художественной и краеведческой литературы.*

*Знаковое событие года – это создание клуба литераторов «Пінчукі», который объединил уже более 30 участников.*

*Выражаю признательность за самоотверженный труд, желаю всем крепкого здоровья, счастья, мира и добра.*

Желаю Вам успехов в работе, крепкого здоровья, мира и благополучия.

С уважением,

Алена Ивановна Антошук

## Паважаныя калегі і чытачы!

## Прапануем вашай увазе справаздачу аб дзейнасці бібліятэк за 2016 год. Год быў багаты на значныя падзеі і юбілейныя даты і таму вельмі б хацелася, каб не адна падзея не засталася незаўважанай.

### Сетка бібліятэк

Бібліятэчная сетка налічвае 39 бібліятэк: ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц, Лагішынская гарпасялковая бібліятэка, 37 сельскіх філіялаў, у т. л. 1 бібліятэка-музей.

На няпоўны працоўны дзень працуюць 9 бібліятэк, з іх: на 0,75 стаўкі - 1 бібліятэка, 0,5 стаўкі - 8 бібліятэк.

Па выкананні плана аптымізацыі сеткі арганізацый культуры, іх штатнай колькасці Рашэннем Пінскага раённага выканаўчага камітэта № 323 ад 29.03.2016 г. з 31мая 2016 г. закрыты Дабраслаўская, Дубайская, Вязская і Мокрадубраўская сельскія бібліятэкі. Рашэннем №588 ад 03.06.2016 г. скараціліся штатныя адзінкі ў Лемяшэвічскай СБ на 0,5 стаўкі і Лышчанскай СБ на 0,25 стаўкі.

Мабільная бібліятэка абслугоўвае 60 населеных пунктаў. За дадзены перыяд зроблена – 107 выездаў, абслужана 533 чытача, выдадзена 9228 экз. літаратуры, наведванняў – 2759.

### Лічбавыя паказчыкі

Асноўныя планавыя паказчыкі, якія вызначаюць работу бібліятэк за справаздачны перыяд выкананы: колькасць чытачоў – 27195 (106% да плана), колькасць выдадзеных дакументаў – 381276 (101,6% да плана), наведванняў – 220270 (100% да плана). Наведвальнасць – 8,1.

Віртуальных чытачоў – 3122, наведванняў – 10858.

### Бібліятэкі аграгарадкоў

11 бібліятэк аграгарадкоў абсталяваны камп'ютарнай тэхнікай з падключэннем да сеткі Інтэрнэт і арганізацыяй электроннай пошты. Працягваюць актыўна дзейнічаць 8 публічных цэнтраў прававой інфармацыі: у Лагішынскай ГпБ, Плешчыцкай, Малоткавіцкай, Парахонскай, Жыдчанскай, Аснежыцкай, Валішчанскай СБ і Лапацінскай бібліятэцы-музеі А. Блока.

За 2016 год бібліятэкі аграгарадкоў атрымалі ў сярэднім па 101 экз. кніг і па 34 назвы перыядычных выданняў.

### Аўтаматызацыя

На 2016 год у бібліятэках налічваецца 61 камп'ютар (17 - у ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц ), 46 прынтараў (15 - у ЦРБ імя Я. Янішчыц), 33 сканера (**7** - у ЦРБ імя Я. Янішчыц), 12 ШФП.

У аўтаматызаваным рэжыме вядзецца камплектаванне, апрацоўка літаратуры і абслугоўванне чытачоў у Пінскай ЦРБ імя Я. Янішчыц. Колькасць бібліяграфічных запісаў у электронным каталозе складае – 63504.

Вядзецца работа па інфармацыйнаму напаўненню раздзелаў Web-сайта ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц. Колькасць карыстальнікаў - 3122, наведванняў – 10858.

### Платные паслугі

Бібліятэкі аказвалі 32 віда дадатковых платных паслуг, што дазволіла мець дадатковыя крыніцы фінансавання. Усяго бібліятэкамі заробленa 13568,8 руб., план выкананы на 117%. Па -ранейшаму найбольш запатрабаванымі паслугамі з'яўляюцца: выдача літаратуры з камерцыйных фондаў, аказанне паслуг з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій, ксеракапіраванне.

Праца па мэтавых праграмах

Бібліятэкі выконвалі мерапрыемствы рэспубліканскіх, абласных і раённых праграм "Зямля бацькоў – жыцця крыніца", "Стиль жизни – здоровье", "Сонечныя промні чытання" і "Свет православия". У 2016 г. па мэтавым праграмам працавалі пяць спецыялізаваных бібліятэк: Пачапаўская сельская бібліятэка гісторыка-краязнаўчага адраджэння, Дамашыцкая СБ сямейнага чытання, Сошненская СБ экалагічнага выхавання і адукацыі насельніцтва, Азарыцкая сельская бібліятэка народнай медыцыны і Пінкавіцкая сельская бібліятэка.

Масавая работа

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2015 г. №522 быў абвешчаны Годам культуры. За год у бібліятэках дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" праведзена 1888 мерапрыемстваў. Найбольш поўнаму забеспячэнню культурна-асветніцкіх патрабаванняў карыстальнікаў садзейнічала работа дзеючых пры бібліятэках 69 аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах, у тым ліку 15 ЛПГ і 5 лялечных гурткоў.

Прыцягненню чытачоў, раскрыццю кніжнага фонду ў рамках Года культуры садзейнічалі кніжныя выставы «Память народа культура хранит» (Аснежыцкая СБ), «Духовность и культура – будущее Беларуси» (Кашавіцкая СБ), «Духовность. Нравственность. Культура» (ЦРБ імя Я. Янішчыц), «Мир культуры» (Малоткавіцкая СБ), «Очаг культуры негасимый» (Парахонская СБ), «К истокам народной культуры» (Лышчанская СБ), «Истоки белорусской культуры» (Валішчанская СБ), "Культура и обычаи моей страны" (Каўняцінская СБ).

Знакавай падзеяй у Год культуры стала адкрыццё клуба літаратараў Піншчыны пры цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц. Яго стварэнне дало новы імпульс для творчасці літаратараў, пашырыла магчымасць для сустрэч з чытачамі, садзейнічае знаёмству апошніх з прозай і паэзіяй сваіх талентавітых землякоў. Павіншаваў прысутных з адкрыццём літаратурнага клуба намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі С. В. Падшывалаў. Кожны з прысутных літаратараў меў магчымасць прачытаць перад шматлікай аудыторыяй свае творы, было дадзена слова і пачынаючым паэтам. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ляшук Марыя Іванаўна выказала падзяку маладым аўтарам за тое, што яны прыйшлі на сустрэчу і падзяліліся сваімі творамі. Да адкрыцця клуба пісьменнікаў была падрыхтавана кніжная выстава "Паэтычныя галасы Піншчыны". У завяршэнне вечара было прынята рашэнне аб тым, што літаратурны клуб Піншчыны будзе арганізоўваць сустрэчы ў апошнюю пятніцу кожнага месяца *(Полесская правда. - 2016. – 19 сакавіка; Народная трыбуна. – 2016.- 18 сакавіка; Варяг пресс. – 2016. – 25 сакавіка; Сельская газета. – 2016.- 7 красавіка; "Белтэлерадыёкампанія Брэст". – 2016. – 12 сакавіка; ТРК "Варяг". – 2016.- 12 сакавіка; ТРК "Пінск". - 2016. – 12 сакавіка).*

Адзін з галоўных напрамкаў работы бібліятэк – краязнаўства, захаванне культурнай і гістарычнай спадчыны. На працягу года бібліятэкары вядуць пошуковую і даследчую работу па збору матэрыялаў аб сваім краі, ладзяць сустрэчы з цікавымі, таленавітымі і творчымі людзьмі. У рамках раённай мэтавай праграмы "Зямля бацькоў – жыцця крыніца" у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц прайшло мноства цікавых мерапрыемстваў. Адным з іх была творчая сустрэча "Мелодыі яе душы…" з нашай талентавітай зямлячкай, паэтэсай Марыяй Кобец. *(Полесская правда. - 2016. – 26 сакавіка; "Белтэлерадыёкампанія Брэст". – 2016. – 22 сакавіка; ТРК "Варяг". – 2016.- 22 сакавіка; ТРК "Пінск". - 2016. – 22 сакавіка).*

Значнай падзеяй у рамках дадзенай праграмы была прэзентацыя кніг Мікалая Васільевіча Елянеўскага «Радкі, напісаныя сэрцам» ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц. Мікалай Васільевіч – таленавіты пісьменнік і журналіст, майстар дакументальнай прозы, у мінулым - рэдактар газеты "Полесская правда". *(Полеская правда. - 2016. - 23 красавіка; ТРК "Варяг". – 2016. - 21 красавіка).*

На эмацыянальным пад’ёме ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц адбыўся тэматычны вечар «Жыццём паспей дабро тварыць...», прысвечаны ветэрану-меліяратару, аўтару ўрачыстага гімна меліяратарам, паэту, члену клуба літаратараў Піншчыны "Пінчукі" Міхаілу Паўлавічу Башчуку. На мерапрыемстве прысутнічалі будучыя меліяратары – навучэнцы 231 групы УА «Пінскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж» імя А. Кляшчова, члены клуба літаратараў "Пінчукі", чытачы бібліятэкі. На мерапрыемстве выступілі, пажадалі здароўя і творчых поспехаў Міхаілу Паўлавічу члены клуба літаратараў "Пінчукі": былы калега, меліяратар Карогвіч І.М., Г.І. Лазіцкая, Ж.Я. Завадская. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Іванавіч Шушко прачытаў свой верш, прысвечаны М. П. Башчуку *(Полесская правда.- 2016. - 4 чэрвеня. - С. 2.; Народная трыбуна. – 2016. — 3 чэрвеня. — С. 3; ТРК “Варяг”. – 2016. - 5 чэрвеня).*

Супрацоўнікі ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц правялі ў Калавуравіцкай яслі-сад – сярэдняй школе літаратурны вечар «Настаўнік. Паэт. Грамадзянін», прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння Алеся Бібіцкага. *(Народная трыбуна. – 2016. – 2 верасня. - №36. – С.3; Заря. – 2016. – 8 верасня. - №104. – С.7; Полесская правда. – 2016. – 10 верасня . - №73. – С.4).*

Свята вёскі – гэта народнае гулянне, якое сімвалізуе любоў да малой Радзімы, павагу да продкаў і старэйшаму пакаленню. Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц сумесна з народным ансамблем народнай песні «Рабіначкі» і аўтаклубам “Вестник” пабывалі на свяце вёскі Месяцічы, якой у гэтым годзе споўнілася 500 гадоў. Супрацоўнікамі бібліятэкі была падрыхтавана літаратурна-музычная кампазіцыя “Святая, як хлеб, вёсачка мая ...». Супрацоўнікі Малоткавіцкай СБ прынялі актыўны ўдзел у правядзенні свята вёскі "Зямля пад белымі крыламі". У парку ля Дома культуры была аформлена краязнаўчая выстава «Пазнай мінулае сваёй Зямлі». На ёй былі прадстаўлены старыя фотаздымкі аднавяскоўцаў, прадметы даўніны. Таксама была праведзена дзіцячая гульнёвая праграма. Бібліятэкары Каменскай СБ сумесна з работнікамі Дома культуры правялі свята вёскі “Пагост вітае землякоў”. Прысутныя з цікавасцю пазнаёміліся з выставай “І будзе голас землякоў гучаць над роднаю старонкай”, дзе былі прадстаўлены фотаальбомы, тэматычныя папкі і літаратура аб родным краі (*Полесская правда. – 2016. – 27 августа. - №69. – С.11).*

Бібліятэкары Парахонскай СБ правялі для вучняў школы гістарычны экскурс “Падарожжа па старонках гісторыі зямлі Парахонскай”. Бібліятэкары распавялі гісторыю ўзнікнення вёскі, правялі агляд разгорнутай кніжнай выставы “Мая любоў і лёс мой – Парахонск”.

Бібліятэкары праводзяць маштабную працу па **патрыятычнаму выхаванню**, выкарыстоўваючы ўвесь арсенал формаў і метадаў бібліятэчнай дзейнасці.

З *3 па 9 мая* ў бібліятэках праходзіў *Тыдзень ваеннай кнігі “Прочитать о войне, чтобы знать и помнить”.* Літаратурна-паэтычная група "Сузор'е" цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я. Янішчыц, аўтаклуб "Весник" і народны калектыў народнай песні "Маладзіцы" Парахонскага сельскага Цэнтра культуры і вольнага часу напярэдадні свята Перамогі правялі літаратурна-музычную кампазіцыю "И снова май, цветы, салют и слёзы" у весках Беразцы і Маладзельчыцы, самых аддаленых вёсках Пінскага раёна. Жыхары в. Беразцы сабраліся на пляцоўцы каля помніка загінуўшым героям. Да помніка ўсклалі жывыя кветкі *(Полесская правда. – 2016. – 20 мая. – С. 10).*

У бібліятэках прайшлі традыцыйныя ўшанаванні ветэранаў на даму. Бібліятэкар Кончыцкай СБ сумесна з Домам культуры і сярэдняй школай арганізавалі ўшанаванне на даму ветэрана Вялікай Айчыннай вайны В.Д. Кавалеўскага.

Бібліятэкар Чухаўскай СБ сумесна з работнікамі сельскага клуба прыйшлі да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны І. К. Шушко і Г. В. Федковіч з кветкамі, песнямі і цёплымі віншаваннямі.

Да *Дня памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны* з 21 па 23 чэрвеня ў Лагішынскай ГпБ стартаваў бібліятэчны ваяж міласэрнасці "Калі ўся краіна надзела шынялі", у рамках якога прайшоў урок мужнасці "Калі б камяні маглі гаварыць», гутарка «Дзеці вайны», экскурсія «Паклонімся ахвярам фашызму», а таксама ўдзельнікі аматарскага яб'яднання «Ровесник» наведалі ў Доме міласэрнасці былую вязніцу Мамчур Е. І. 22 чэрвеня, у дзень пачатку вайны хлопцы старэйшага атрада школьнага лагера разам з бібліятэкарам здзейснілі экскурсію да святога месца ў Лагішыне: памятнага знака, які быў усталяваны 23 верасня 2009 года на месцы, дзе ў лютым 1943 г. былі зажыва спалены 15 жыхароў пасёлка. З мастацкімі творамі пра вайну чытачы пазнаёміліся на выставе-панараме «У памяці людской імгненні вайны», «Напісана вайной - увекавечана літаратурай», «Чытаем кнігі пра вайну».

Прайшлі гістарычна-пазнавальныя гадзіны "Под звездой Евфросинии Полоцкой" у Жыдчанскай СБ, «Жыццё, адданае Богу» у Азарыцкай СБ, "Апякунка Беларусі" у Аснежыцкай СБ.

Да *Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь* у бібліятэках афармляліся кніжныя выставы і тэматычныя паліцы "Бусліны край, мой вырай і прыстанак" (Парэцкая СБ), "Квітней, мой край, зямля бацькоў" (Малоткавіцкая СБ), "Край беларускі – край самабытны" (Кашавіцкая СБ), "Твая зямля, твая Радзіма названа светла – Беларусь" (Лышчанская СБ). Выступленне ЛПГ «Спадчына» «Ганаруся табою, Беларусь сінявокая» прайшло ў Валішчанскай СБ. Бібліятэкар Калавуравіцкай СБ правяла пазнавальную віктарыну "Мая Беларусь".

**Папулярызацыя здаровага ладу жыцця** - адзін з самых актуальных напрамкаў у рабоце бібліятэк раёна. Да *Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам* у бібліятэках раёна прайшоў *Тыдзень прафілактыкі наркаманіі "Против зла вместе"*. У бібліятэках у рамках Тыдня праводзілася мноства мерапрыемстваў. Так, у Лагішынскай ГпБ прайшоў шок-урок "Наркомания. Путь туда и обратно". Аб праблеме наркаманіі ў Лышчанскай СБ расказала загадчыца ФАПа Н. В. Верыч і ўчастковы інспектар М. А. Калеснікові ч у час правядзення вечара пытанняў і адказаў "Жизнь прекрасна! Не губите её" для вучняў 8-9 класаў.

Да *Сусветнага дня здароўя* адбылося выступленне ЛПГ "Сузор'е" у вёсцы Тырвовічы з кампазіцыяй "Здоровым быть – в радости жить". Бібліятэкары Пінкавіцкай СБ прынялі актыўны ўдзел у флэш-мобе "За здаровы лад жыцця", у рамках якога арганізавалі конкурсна-гульнёвую праграму "Здоровому – всё здорово".

У рамках *інфармацыйна-адукацыйнай акцыі "Брестчина без табака",* супрацоўнікі ЦРБ імя Я. Янішчыц для моладзі правялі гадзіну здароўя "Табачный туман обмана". У чытальнай зале была аформлена кніжная выстава "Мой выбор - не курить". Бібліятэкар Чухаўскай СБ для моладзі арганізавала сустрэчу з фельчарам Рэбкавец М. А. па тэме "Курение вредит вашему здоровью".

У *рамках абласной акцыі "Здоровому образу жизни – Да!"* у бібліятэках прайшлі розныя па формах мерапрыемствы. У Пінкавіцкай СБ прайшоў Дзень здароўя «Краіна здаровага дзяцінства». У Кашавіцкай СБ Дзень здароўя прайшоў пад назвай «Мы за здаровы лад жыцця». Бібліятэкар правяла агляд кніжнай выставы «Азбука здароўя», затым прайшла конкурсна-гульнёвая праграма з элементамі гутаркі *(Полесская правда. – 2016. – 17 сентября. - №75. – С. 6).* Бібліятэкар Валішчанскай СБ правяла тэматычную праграму "Здоровье – это здорово".

Разнастайную і цікавую работу вялі бібліятэкі па **духоўна-маральнаму выхаванню.** Да *Светлага дня Пасхі* ў Плешчыцкай СБ адбыўся гістарычны экскурс “Пасхальный перезвон”. У Пінкавіцкай СБ прайшлі бібліятэчныя вячоркі “И свет духовности не гаснет” у рамках пасяджэння аматарскага аб’яднання “Каўчэг”. У Садоўскай СБ прайшло пасяджэнне аматарскага аб’яднання “Современница” пад назвай “Светлый праздник Пасхи”.

У справаздачным годзе актыўна вялася работа з **сацыяльна неабароненымі катэгорыямі чытачоў**. Супрацоўнікі бібліятэк надаюць вялікую ўвагу ў сваёй працы вечным каштоўнасцям – дабру і міласэрнасці. Неад’емнай часткай работы стала дабрачыннае абслугоўванне інвалідаў, пажылых людзей з абмежаванымі магчымасцямі на даму. Да *Міжнароднага дня інвалідаў* выступленне паэтычнай групы “Сузор’е”, аўтаклуба “Веснік” і калектыву мастацкай самадзейнасці ЭлКіс “Согреем ладони, разгладим морщины” прайшло ў Жабчыцкім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце. У Лагішынскай ГпБ прайшоў вяяж міласэрнасці “Жизнь всегда прекрасна”. Удзельнікі ЛПГ “Факел” выступілі ў цэнтры “Друзья детей Чернобыля” з літаратурна-музычнай кампазіцыяй “А жизнь другую не прожить”.

На працягу года праводзілася работа бібліятэк па выхаванню **прававой культуры** ў карыстальнікаў. Бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел у выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. Гутарка з маладымі выбаршчыкамі “Молодёжь и избирательное право” прайшла ў Валішчанскай СБ. Бібліятэкары Плешчыцкай СБ правялі агляд перыядачных выданняў “Выборы на страницах печати”. Бібліятэкары Малоткавіцкай СБ для моладзі правялі прававую гульню “Ты гражданин, а это значит…». Гульня складалася з пяці этапаў: «У лабірынце паняццяў», «Юрыдычныя задачы», «З чатырох – адзін», «Адвакацкая кантора», «Юрыдычная азбука».

**ЛІТАРАТУРНЫЯ ЮБІЛЕІ**

Дзейнасць бібліятэк у 2016 годзе была накіравана на папулярызацыю літаратурных юбілеяў. Літаратурныя юбілеі адзначаліся вечарынамі, кампазіцыямі, гадзінамі паэзіі, гульнямі. У бібліятэках праводзіліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да юбілейных дат беларускіх і замежных паэтаў і пісьменнікаў.

**Да 95-годдзя з дня нараджэння І. Шамякіна** супрацоўнікі ЦРБ імя Я. Янішчыц правялі літаратурны вечар “Творца праўдзівага часу”. На мерапрыемства былі запрошаны вучні старэйшых класаў Пінкавіцкай школы (35 чал.). Госцем мерапрыемства быў мясцовы паэт Анатоль Шушко, які расказаў аб сваіх сустрэчах з Іванам Шамякіным *(Полесская правда. - 2016. – 3 лютага).* Бібліятэкары Плешчыцкай СБ падрыхтавалі электронную прэзентацыю “Мастак вялікага грамадскага абавязку”.

**Да 95-годдзя з дня нараджэння І. Мележа** ў Плешчыцкай СБ прайшло выступленне літаратурна-паэтычнай групы “Ветразь” “А на зямлі яго не згасне свет”. У час мерапрыемства была паказана электронная прэзентацыя і інсцэніроўка ўрыўка з рамана І. Мележа “Людзі на балоце”. Літаратурныя вечары “Вялікі дар нашчадкам” прайшлі ў Аснежыцкай, Ахоўскай, Кончыцкай СБ. Дас’е юбіляра “А на зямлі яго не згасне свет” арганізавалі бібліятэкары Пінкавіцкай СБ. Прысутныя на мерапрыемстве вучні 11 класа пазнаёміліся з біяграфіяй пісьменніка, яго творчасцю.

**Да 60-годдзя з дня нараджэння У. Ягоўдзіка** літаратурную карусель “Як цікава ўсё на свеце з кнігамі У. Ягоўдзіка ўсім дзецям” арганізавалі бібліятэкары Малоткавіцкай СБ. Прысутнічала 16 чалавек. У Лагішынскай ГпБ была праведзена літаратурная гульня “З Уладзімірам Ягоўдзікам па беларускаму краю”. Бібліятэкары Каменскай СБ правялі для дзяцей малодшага ўзросту літаратурную гульню “Чароўны свет У. Ягоўдзіка”.

**Да 130-годдзя з дня нараджэння З. Бядулі** агляд-знаёмства “Змітрок Бядуля – дзецям” прайшло ў Бабрыкоўскай СБ, да мерапрыемства была афомлена кніжная выстава “Пісьменнік адзначае юбілей”. З жыццём і творчасцю З. Бядулі прысутных пазнаёміла настаўніца беларускай мовы і літаратуры А. І. Банцэвіч. У Аснежыцкай СБ быў арганізаваны літаратурны вечар “З плеяды першых”. У Плешчыцкай сельскай бібліятэцы быў праведзены літаратурны агляд “Роднае зямлі ўдзячны сын”.

**Да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча** ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя “Геній роднага слова”. Знамянальна тое, што гэтае свята было арганізавана ў дні беларускага пісьменства. На мерапрыемстве прысутнічала звыш 80 чалавек. Мерапрыемства суправаджала мультымедыйная прэзентацыя і чароўная музыка песен на словы Максіма Багдановіча. На кніжнай выставе “У вянок Максіму Багдановічу” быў адлюстраваны жыццёвы шлях і этапы паэтычнага станаўлення народнага песняра *(Полесская правда. – 2016. – 7 сентября. - №72. – С. 3)*. Выступленні ЛПГ прайшлі ў Плешчыцкай СБ “Нязгасная зорка, ты ў небе Радзімы навекі”, у Каменскай СБ “Незабыўны Максім Багдановіч”. Бібліятэкары Пінкавіцкай СБ правялі літаратурна-музычную кампазіцыю “Нязгасная зорка Максіма Багдановіча”.

**Работа з дзецьмі**

Важным напрамкам дзейнасці бібліятэк з’яўляецца работа з дзіцячым чытачом. План па аблугоўванню дзіцячага чытача выкананы. Аблужана 6239 чытачоў (109,5%), кнігавыдача склала 108223 экз. бібліятэчных дакументаў (109%), колькасць наведванняў – 65803 (105,8%).

Для чытачоў-дзяцей працавала 5 лялечных гурткоў і 34 аматарскіх аб’яднанняў.

Бібліятэкі папулярызавалі краязнаўчыя, экалагічныя, прававыя веды, здаровы лад жыцця. У бібліятэках праводзіліся летнія чытанні, адзначаліся літаратурныя юбілеі.

У дні вясновых канікул традыцыйна праводзіўся *Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі «Книга на каникулах»* пад дэвізам «Читайте сами, читайте с нами». На працягу тыдня бібліятэкарамі ладзіліся розныя па форме і зместу мерапрыемствы: гульні, цікавыя сустрэчы з літаратурнымі героямі, святы. Кожны дзень Тыдня быў прысвечаны якой-небудзь тэме: дзень гасціннасці, дзень патрыятызма, дзень краязнаўства, дзень беларускай кнігі, дзень экалогіі, дзень казак, дзень інфармацыйных тэхналогій. На экскурсію ў Пінскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Янішчыц былі запрошаны старэйшыя групы дзіцячага сада №42. Бібліятэкар Міхальчанка Л. А. пазнаеміла дзяцей з бібліятэкай, распавяла аб дзіцячым кніжным фондзе, які размешчаны ў кутку пад назвай «Детская вселенная» *(Полесская правда. - 2016. – 6 красавіка).*

Традыцыйна ў бібліятэках праводзяцца *летнія чытанні*. Праграммы летніх чытанняў пачыналіся са святаў, прысвечаных *Міжнароднаму дню абароны дзяцей.* Так, тэатралізавана-гульнёвае прадстаўленне “За руки возьмёмся и улыбнёмся” супрацоўнікі Парахонскай СБ арганізавалі сумесна з СЦКіД. У Пінкавіцкай СБ тэатралізавана-гульнёвае прадстаўленне прайшло пад назвай “В краски яркое одето к нам приходит лето”. Да мерапрыемства была афомлена кніжная выстава “Добрые книжки девчонкам и мальчишкам”.

“В прекрасной стране детства” пад такой назвай у Плешчыцкай сельскай бібліятэцы прайшла гульнёва-пазнавальная праграма. Дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў конкурсах, гульнях, разгадвалі загадкі. На тэрыторыі бібліятэкі праведзены чытанні на лужайцы захапляючых прыгод і казак. А са сцэны СЦК і ВЧ гучалі песні ў выкананні юных спявачак – Шпакоўскай Нікі, Таўлуй Лізы, Каляды Дашы.

Конкурсную праграму “Міні-міс” для дзяцей малодшага атрада школьнага лагера арганізавалі бібліятэкары Лагішынскай ГпБ. У конкурсе прымалі ўдзел дзесяць дзяўчынак 1-2 класа. Яны спаборнічалі ў конкурсах “Хозяюшка”, “Василиса Премудрая”, “Угадай мелодию” і інш.

Бібліятэкары Аснежыцкай СБ правялі для дзяцей літаратурную гульню «Чтобы было интересно - и тебе, и мне, и вам!». Прысутныя пазнаёміліся з кніжнай выставай «Літаратурная карусель». Актыўна прымалі ўдзел у такіх конкурсах: «Складзі прыказку!», «Кошык казак», «Казачны тэст». Складалі літаратурныя анаграмы, удзел у якіх дазволіла ім успомніць любімых казачных герояў, аўтараў казак і самі творы.

Бібліятэкары Пінкавіцкай СБ для чытачоў арганізавалі выставу дзіцячага “хэндмейда” “Умелыя рукі нашых чытачоў”. Сваімі работамі падзяліліся наведвальнікі дзіцячага летняга лагера “Вясёлка”. На кніжнай выставе “Для ўмелых рук парады” была прадстаўлена літаратура і часопісы з цікавымі парадамі па рукадзеллю.

Разнастайную і цікавую работу вялі бібліятэкі па **экалагічнаму выхаванню.** Да *Дня аховы навакольнага асяроддзя* ў Аснежыцкай СБ у рамках пасяджэння аматарскага аб’яднання “Эрудыт” прайшло экалагічнае падарожжа “Разноцветная моя Земля”. У ходзе мерапрыемства дзеці наведалі станцыю “Природные барометры”, дзе праявілі свае веды аб народных прыкметах.

Да *Сусветнага дня птушак* у Парэцкай СБ быў арганізаваны конкурс дзіцячых малюнкаў “Птушкі нашы суседзі на Зямлі”. У Садоўскай СБ прайшло пасяджэнне аматарскага аб’яднання “Зелёная гостиная” пад назвай “Семь страниц про зверей и птиц”. У Кашавіцкай СБ у рамках пасяджэння аматарскага аб'яднання «Юны эколаг» прайшла гульня-падарожжа «Адкрый для сябе дзіўны свет птушак».

## Рэклама бібліятэк

З мэтай стварэння і замацавання станоўчага іміджу бібліятэк у грамадстве бібліятэкары ажыццяўляюць шырокую рэкламу бібліятэчнай дзейнасці і паслуг бібліятэк. Значную ролю адыгрываюць акцыі, юбілеі бібліятэк, заснаванне аматарскіх аб’яднанняў, клубаў па інтарэсах. Папулярызацыі кнігі і чытання спрыяе цэлы комплекс шырокамаштабных акцый, праграм і мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў бібліятэках.

У бібліятэках дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” ў лютым месяцы прайшлі справаздачы перад насельніцтвам пад дэвізам «Чароўны свет кнігі».

З *12-18 верасня* прайшоў *рэкламны Тыдзень бібліятэк “Праз бібліятэку - у будучае”*, ён стаў традыцыйным у апошнія гады як для бібліятэк, так і для чытачоў. Асаблівая ўвага надавалася рэкламе. Так, у Парэцкай СБ прайшло свята для актыўных чытачоў “Дом, у якім жывуць кнігі”. Супрацоўнікі Лагішынскай ГпБ правялі дзень адчыненых дзвярэй “Путешествие в книжное царство – библиотечное государство”. У гэты дзень для чытачоў была прадстаўлена электронная прэзентацыя бібліятэкі “Віват табе, бібліятэка!”, выстава вырабаў супрацоўнікаў бібліятэкі “Женских рук прекрасное творенье”. Віртуальнае падарожжа па бібліятэкам свету “Библиотеки всех стран приглашают” прадэманстравала бібліятэкар Жыдчанскай СБ вучням 5-8 классаў. Праведзена інфармацыйная работа па прапагандзе дзейнасці бібліятэк у сродках масавай інфармацыі. За 2016 г. дзейнасць бібліятэк сістэмы асвятлялася 58 раз, ў такіх выданнях як “Полесская правда”, “Пінскі веснік”, “Варяг-пресс”, “Народная трыбуна”, “Сельская газета”, “Бібліятэчны свет”, “Вечерний Брест”, 11 разоў прайшлі сюжэты на тэлеперадачах ТРК “Варяг”, ТРК “Пінск”, ”Белтэлерадыёкампаніі Брэст”.

З сродкаў масавай інфармацыі можна было даведацца пра новыя кніжныя выставы, новыя паступленні дакументаў у бібліятэкі, літаратурныя і тэматычныя вечары, прэзентацыі кніг і інш. Бібліятэкі штотыдзень падаюць інфармацыю аб правядзенні мерапрыемстваў у мясцовую газету "Полесская правда" у рубрыку "Маршрутами выходного дня". Інфармацыя аб рабоце бібліятэк змяшчаецца на бібліятэчным сайце.

Рэклама бібліятэк прайшла ў форме бенефісаў: да 70-годдзя з дня ўтварэння Парахонскай сельскай бібліятэкі быў прысвечаны бенефіс "Библиотека зовёт на праздник" *(Полесская правда. - 11 чэрвеня. - 2016. - С.11.).*

28 лістапада адбыўся бенефіс Лапацінскай бібліятэкі-музея А. Блока "Бібліятэка – усім нам мілы дом", прысвечаны 70-годдзю з дня яе заснавання *(Полесская правда. – 2016. – 3 декабря. – 397. – С.4.).*

Анонсы і інфармацыя пра ўсе мерапрыемствы, падзеі і навіны размяшчалася на галоўнай старонцы інфармацыйнага сайта бібліятэкі ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.

Для карыстальнікаў у бібліятэках аформлены інфармацыйныя стэнды, дзе размешчана рэкламная інфармацыя.

## МАРКЕТЫНГАВАЯ РАБОТА

Метадычнае забеспячэнне бібліятэчнай дзейнасці было накіравана на пошук новых форм і метадаў бібліятэчнай работы, распаўсюджванне перадавога бібліятэчнага вопыту, аказанне метадычнай і практычнай дапамогі бібліятэкарам. Супрацоўнікі аддзела знаходзяцца ў пастаянным творчым пошуку.

Эфектыўнай формай дапамогі бібліятэчным супрацоўнікам па-ранейшаму застаюцца семінары, на якіх работнікі аддзела маркетынгу рыхтавалі кансультацыі з прымяненнем інфармацыйных тэхналогій. Быў арганізаваны **раённы семінар для работнікаў бібліятэк "Любительские объединения как одна из форм проведения досуга пользователей в библиотеке"**.

Па тэме бібліятэчнай рэкламы прайшоў **семінар-практыкум бібліятэчных работнікаў «Выкарыстанне бібліятэчнай рэкламы ў дзейнасці бібліятэк».** Семінар быў прысвечаны значэнню і асаблівасцям рэкламы, рэкламна-выдавецкай дзейнасці, прымяненню рэкламы ў дзейнасці бібліятэк.

22 красавіка на базе Пінкавіцкай сельскай бібліятэкі адбыўся **раённы семінар бібліятэчных работнікаў "Духовно-нравственное воспитание как приоритетное направление библиотечной работы"** *(Полесская правда. – 2016. — 21 мая. — С. 11).*

У лістападзе на базе Лагішынскай ГпБ адбыўся **круглы стол "Библиотека – информационный центр по формированию здорового образа жизни".** Круглы стол быў прысвечаны пытанням важнасці правядзення прафілактычнай работы бібліятэк па папярэджанні негатыўных з'яў сярод дзяцей і моладзі.

У ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц для работнікаў бібліятэк раёна быў праведзены **круглы стол "Вынікі работы дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" за 2016 год: дасягненні і перспектывы"**.

### Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне

1. Падрыхтавана 4 "Бюлетэня новых паступленняў літаратуры ў дзяржаўную установу культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" за IV квартал 2015 г., за I, II, III кварталы 2016 г.

2. Праведзена 4 Дні інфармацыі па новых паступленнях літаратуры ў дзяржаўную установу культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" за IVквартал 2015 г., за I, II, III кварталы 2016 г.

3.Аформлены раздзяляльнікі ў сістэматычную картатэку артыкулаў: “2016 - Год культуры”, “Навстречу выборам” і ў краязнаўчую картатэку “2016 год – Год культуры на Піншчыне”, “Башчук М.”, “Інфармацыя аб выбарах”.
4. Аформлены тэматычныя папкі “Михаил Бощук”, “Палесскі дзяржаўны універсітэт”, “Выборы в Палату представителей Национального собрания Республики Беларусь шестого созыва”.
5. Створана БД “Пинский район в республиканской и областной печати” за 2016 г.
6. Працягваецца праца над папаўненнем электроннай БД “Яўгенія Янішчыц”.
7. Складзены тэкставыя даведкі для базы даных “Беларусь у асобах і падзеях”:

- да 80-годдзя з дня нараджэння Вячеслава Іванавіча Бацюшко, вучонага ў галіне будаўнічай вытворчасці, выдатніка ваеннага будаўніцтва, выдатніка вышэйшай школы СССР, педагога;
- да 65-годдзя з дня нараджэння Анатоля Міхайлавіча Хвісевіча, мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, афарміцеля, жывапісца;
- да 75-годдзя з дня нараджэння Мікалая Уладзіміравіча Румака, вучонага ў галіне мікраэлектронікі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі;
- да 80-годдзя з дня нараджэння Івана Сцяпанавіча Шпакоўскага (1936, Пінскі раён), літаратуразнаўца, крытыка;
- да 70-годдзя з дня нараджэння Валянціны Іванаўны Локун (1946-2016), паэткі, літаратуразнаўцы, лаўрэата прэміі Прэзідэнтаў акадэміі навук Украіны, Беларусі і Малдовы (2004), двойчы лаўрэата прэміі часопіса “Полымя” (1993,2001), уладальніка медаля Святой Ефрасінні Полацкай (2006).

8. Выканана 437 даведак.
9. У электроннай базе “Аналітыка” выканана 7227 запісаў бібліяграфічных апісанняў артыкулаў газет і часопісаў (у т. л. 3561 – у базе “Краязнаўства”.

**ПЦПІ** змяшчае банкі данных: “Заканадаўства Рэспублікі Беларусь”, “Міжнародныя дагаворы”, “Рашэнні органаў мясцовага кіравання”, “Правапрымяняльная практыка”, “БД Формы дакументаў”. Абнаўляецца ПЦПІ штодзённа.

Асноўныя катэгорыі карыстальнікаў – студэнты, школьнікі, навучэнцы сярэдне-спецыяльных устаноў, служачыя, рабочыя, прадпрымальнікі, пенсіянеры і беспрацоўныя.

У прававой базе “Эталон” абслужана 212 карыстальнікаў.

Выконваюцца паслугі (усе платныя): пошук дакументаў у прысутнасці заказчыка; вывад інфармацыі на друкаваны носьбіт; вывад інфармацыі на электронны носьбіт; фармаванне пакета дакументаў. Выканана платных паслуг на суму 345.15 рублей (у тым ліку па прававой базе “Эталон” – на суму 145.20 руб.)

**Новыя напрацоўкі на працягу года. Праблемы. Прапановы**

По ўсіх напрамках бібліятэчных паказчыкаў калектыў спрацаваў станоўча. Перспектыва развіцця бібліятэк накіравана на выкананне планавых паказчыкаў, фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў, удасканаленне сістэмы інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва, стварэнне ўмоў для ўмацавання і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк і бібліятэчнай справы.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 481 ад 23 снежня 2016 г. 2017 год быў абвешчаны Годам навукі ў Рэспубліцы Беларусь. Правядзенне Года навукі будзе садзейнічаць выкананню задач узаемадзеяння навукі з культурнай сферай,
стварэнні спрыяльных умоў у бібліятэках раёна для стварэння і захавання навуковага патэнцыялу.

**Всё начинается с культуры**

Культура – это фундамент, на котором и развивается любая нация, определяются её жизнеспособность, творческий потенциал. Она лежит в основе идеологии государств. Указывает те направления и цели, на которые должно ориентироваться общество.

А. Г. Лукашенко

# Из опыта работы Поречской СБ

Большую разнообразную программу мероприятий в течение года провела для своих читателей  Поречская СБ. Библиотека открыла этот год выставкой-просмотром «2016: Год культуры». Разделы выставки говорили сами за себя: «Музыкальное творчество», «Театральное искусство», «Музейное дело», «Изобразительное искусство». Кроме того были представлены книги земляков П. В. Николайчика, Марии Ляшук, Михаила Бощука, знаменитой белорусской писательницы Е. Янищиц. Интересными стали заставки-цитаты известных людей о культуре. В течение всего года выставка пополнялась различными материалами по данной тематике и пользовалась большим спросом у читателей.

Используя традиционные и инновационные формы и методы работы, целями которых являлись - привлечение внимания общества к вопросам развития культуры, сохранение культурно-исторического наследия и роли белорусской культуры во всем мире, в библиотеке были организованы и проведены для читателей циклы книжно-иллюстративных выставок, тематические и литературно-музыкальные вечера, праздники, конкурсы, акции.

Тематика мероприятий: «Палескай зямлі волат», «Через православную книгу – к духовности», «Путешествие в книжный дом», «Память о войне нам книга оставляет», «Путешествие в страну родного языка!», «Через библиотеку к будущему», «Чистота родного края» и др.



Все мероприятия носили глубоко-познавательный, яркий эмоциональный характер, сопровождались видео - сюжетами, электронными презентациями, музыкальным и наглядно-иллюстративным оформлением.

Любая библиотека «обречена» постоянно обновляться, чтобы отвечать на запросы стремительно изменяющегося общества. Но залог успешного и устойчивого движения вперед по пути модернизации - сочетание традиционных форм работы с новейшими достижениями информационных технологий. Именно это поможет библиотекам занять достойное место в современном информационном обществе.



Но как бы не менялось время, всегда следует помнить, что «каждая библиотека создана в первую очередь для читателя, и именно он должен быть в центре нашего внимания», а Миссией библиотеки должна оставаться популяризация книги как одного из средств духовного становления личности, ее культуры».

Г. А. Бощук,
библиотекарь Поречской СБ

## Год культуры ў Пінкавіцкай сельскай бібліятэцы

У рамках Года культуры ў бібліятэцы праходзіў шэраг мерапрыемтсваў, накіраванных на фарміраванне высокай культуры грамадства, зберажэння культурнай спадчыны і народных традыцый, выхавання ў грамадзян любові да Радзімы. Бібліятэкары прапанавалі сваім чытачам цікавыя сустрэчы, святы, кніжныя выставы, конкурсы, розныя акцыі і г.д. На працягу года ў бібліятэцы дзейнічала кніжная выстава “Память народа культура хранит”. Год культуры быў багаты на пісьменніцкія юбілеі. Шырока адзначаліся памятныя даты беларускіх пісьменнікаў, паэтаў. Так, да 95 - годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна праходзіла літаратурная гадзіна “Прапаведнік духоўнасці і чалавечнасці”, да 95 - годдзя з дня нараджэння Івана Мележа было падрыхтавана дасье юбіляра “А на зямлі яго не згасне след”. Літаратурная карусель “ Як цікава ўсё на свеце з кнігамі Ягоўдзіка ўсім дзецям”, якая была прымеркавана да 60-годдзя пісьменніка, пазнаёміла чытачоў з біяграфіяй Уладзіміра Ягоўдзіка, яго кнігамі з серыі “Скарбы Радзімы”, потым дзеці адказвалі на пытанні віктарыны. Да 120 - годдзя з дня нараджэння К.Крапівы праводзілася гумарына “Смеху ачышчальная сіла”, на якой дзеці дэкламавалі байкі, а потым разгадвалі красворды па байкам пісьменніка. Конкурсы чытальнікаў вершаў праводзіліся да 110-годдзя з дня нараджэння Агніі Барто і 68-годдзя Яўгеніі Янішчыц. Выставы-знаёмствы з творамі былі прапанаваны да 140-годдзя з дня нараджэння Джэка Лондана і 130-годдзя з дня нараджэння Змітрака Бядулі. “Светлая зорка Максіма Багдановіча” – так называлася літаратурна-музычная кампазіцыя, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння паэта. І ўжо традыцыйна да дня нараджэння Якуба Коласа праходзіла літаратурная вандроўка “Паэт уславіў наш Палескі край”.

Вялікую ўвагу ўдзяляюць бібліятэкары арганізацыі вольнага часу дзяцей у летні час. Для хлопчыкаў і дзяўчынак бібліятэка падрыхтавала разнастайныя па тэматыцы і формах мерапрыемствы, улічваючы інтарэсы школьнікаў і іх ўзроставыя асаблівасці. Асабліва любімымі і прывабнымі для дзяцей з'яўляюцца тэатралізаваныя паказы і падарожжы з удзелам літаратурных і казачных герояў. Старт нясумным кніжным канікулам дало тэатралізаванае свята “В краски яркое одето к нам опять приходит лето”.



Удзельнікі тэатралізаванага свята “В краски яркое одето к нам опять приходит лето”

Разам з кніжнымі героямі дзеці весяліліся, гулялі, прымалі ўдзел у конкурсах, адгадвалі складаныя літаратурныя загадкі. Не менш цікава праходзілі літаратурнае падарожжа "Канікулы ў бібліятэцы", гульня-падарожжа "Па дарогам Кніжкаграда", экалагічная віктарына "Звяры і птушкі – героі казак", конкурсы малюнкаў, выстава дзіцячага "хэндмэйда". Усе мерапрыемства праходзілі ў скверы перад бібліятэкай. "Што нам лета падаравала" – пад такой назвай прайшло закрыццё праграмы летняга чытання. Чытачоў на палянцы сустракала цыганка і прапанавала кожнаму выбраць па тры прадмета, размешчанных на абрусе-самабранцы, назваць іх чароўныя ўласцівасці і назву казкі, у якой гэтыя прадметы сустракаюцца. Потым усе рушылі ў Кніжнае царства, там іх чакалі новыя заданні і выпрабаванні. Паспяхова справіўшыся з усімі выпрабаваннямі дзеці пачалі забаўляцца. І ў завяршэнні праграмы адбылося ўзнагароджанне самых настойлівых, дапытлівых і ўпартых даследчыкаў кніжнага свету.

З 2016 года бібліятэка працуе па праграме "Свет праваслаўя". У сваёй рабоце мы надаем шмат увагі духоўна-маральнаму выхаванню чытачоў. З гэтай мэтай пры бібліятэцы працуе аматарскае аб'яднанне "Каўчэг". Тут збіраюцца аднадумцы для зносін і духоўнага абагашчэння. Да святаў Раждзества Хрыстова і Пасха арганізоўваліся бібліятэчныя вячоркі. У жніўні пасяджэнне



было прысвечана святам Спас, а ў снежні прайшоў Дзень дабра пад назвай "Передай добро по кругу". У красавіку на базе бібліятэкі праходзіў раённы семінар "Духовно-моральное воспитание – как приоритетное направление библиотечной работы" . Да ўвагі ўдзельнікаў семінара была прадстаўлена літаратурна-музычная кампазіцыя "Пока горит свеча". Тэме праваслаўя была прысвечана віртуальная кніжная выстава "Живой родник православной книги", якая ўдзельнічала ў раённым аглядзе-конкурсе "Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения". У верасні бібліятэкары сумесна з васкрэснай школай падрыхтавалі і правялі літаратурную вечарыну "Как слово наше отзовется". Цікавай і незабывальнай адбылася сустрэча з праваслаўнымі пісьменнікамі з Мінска Таццянай Марцавай, Таццянай Гарох, Аленай Піменавай, а таксама з акцёрам і рэжысёрам, стваральнікам праваслаўных спектакляў Яўгенам Піменавым. Адкрыў вечарыну настаяцель Свята-Пакроўскага храма пратаіерэй Міхаіл Ларыёнаў. Прысутныя на мерапрыемстве атрымалі не толькі асалоду, але і вялікую духоўную карысць.

За 2016 год бібліятэку наведала больш за 8000 чытачоў. Усе яны з задавальненнем і цікавасцю ўдзельнічаюць у нашых мерапрыемствах і акцыях . Бібліятэкары прыкладаюць шмат намаганняў для таго, каб кожны, хто прыйшоў у бібліятэку не сышоў з яе нездаволены.

І. А. Палюховіч,
загадчыца Пінкавіцкай сельскай бібліятэкай

# Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения

Всем известно, что только обновление знаний, умений и навыков помогает специалисту сохранять творческую форму, способность к активному усвоению современных идей и экспериментальному поиску. Этому отлично способствуют профессиональные конкурсы.

В целях активизации творческого потенциала сотрудников, продвижения выставочной деятельности в библиотеках, выявления и распространения инновационных форм работы, улучшение качества информационного обслуживания пользователей в государственном учреждении культуры “Пинская районная централизованная библиотечная система” прошел смотр-конкурс «Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения», приуроченный к Году культуры в Беларуси. Организация книжных выставок - это одно из наиболее интересных направлений в работе библиотеки и один из ее атрибутов. Первое впечатление о библиотеке и умении библиотекаря представить книгу складывается у читателя при знакомстве с книжными выставками. Но что же такое эта самая книжная выставка? Практический ответ на это дали участники конкурса, в котором приняли участие 39 библиотек.




Книжная выставка «Земля и мелиорация» ЦРБ имени Евгении Янищиц

Победителями стали: в номинации “Традиционная книжная выставка” Лемешевичская СБ (библиотекарь Степанович Е. В.); в номинации “Нетрадиционная книжная выставка” 1-е место: ЦРБ имени Е. Янищиц (отдел обслуживания и информации зав. Данилович Т. И.), 2-е место: Логишинская ГпБ (зав. Гусина Л.И.), 3-е место: Поречская СБ (библиотекарь Бощук Г. А.); в номинации “Виртуальная выставка” - Пинковичская СБ (зав. Полюхович И.А., библиотекарь Балук О.Н.). За оригинальность подачи материала, творческий подход в оформлении книжной выставки, отмечены библиотекари Молотковичской и Оховской СБ.

**ПОСТАНОВЛЕНИЕ**
Совета отдела идеологической работы, культуры
и по делам молодёжи Пинского райисполкома

От 20 мая 2016г. № 5

О проведении среди библиотек
государственного учреждения культуры
«Пинская районная централизованная
библиотечная система» районного
смотра-конкурса «Библиотечная выставка –
средство рекламы книги и чтения»

В целях активизации творческого потенциала сотрудников, продвижения выставочной деятельности в библиотеках, выявления и распространения инновационных форм работы, улучшение качества информационного обслуживания пользователей, Совет отдела идеологической работы, культуры и по делах молодёжи, райком профсоюза работников культуры **ПОСТАНОВЛЯЕТ:**

Провести районный смотр-конкурс «Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения» провести с 20 по 26 мая 2016 года.

Утвердить положение и состав жюри (Приложение 1,2).

Отделу библиотечного маркетинга ЦРБ имени Е. Янищиц обеспечить участие всех библиотек в районном смотре-конкурсе «Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения».

Контроль за проведением смотра-конкурса возложить на директора государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» Антошук А. И.

Председатель Совета,
начальник отдела
идеологической работы,
культуры и по делам молодёжи
Пинского райисполкома Л. В. Головач

Приложение №1

**ПОЛОЖЕНИЕ**

о проведении среди библиотек
государственного учреждения культуры
«Пинская районная централизованная библиотечная система»
районного смотра-конкурса
«Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения»

**Основные цели и задачи смотра-конкурса**

повышение престижа библиотек как современного информационного и культурного центра;

- улучшение содержательной, методической и психолого-педагогической основы выставочной деятельности библиотек;

- содействие раскрытию книжного фонда;

- улучшение качества информационного обслуживания пользователей, организации массовой работы;

- разработка и внедрение инновационных форм работы по приобщению к книге, стимулирование читательской активности;

- повышение профессионального мастерства сотрудников.

**II. Порядок и условия проведения конкурса**

1. В районном смотре-конкурсе участвуют все библиотеки Пинского района.
2. Конкурс будет проходить по **зонам: 20, 23, 26 мая 2016 года.**

**1-я зона: 20.05.2016г.** Библиотеки Молотковичского, Дубойского Плещицкого, Лопатинского, Ласицкого, Боричевичского, Каллауровичского, Хойновского сельисполкомов.

**2-я зона: 23.05.2016г.** Библиотеки Логишинского, Валищенского, Лыщенского, Бобриковского, Мерчицкого, Поречского, Ставокского, Берёзовичского, Оховского сельисполкомов.

**3-я зона: 24.05.2016г.** ЦРБ им. Е. Янищиц

**4-я зона: 26.05.2016г.** Библиотеки Пинковичского, Городищенского, Сошненского, Парохонского, Н-Дворского, П-Загородского, Оснежицкого сельисполкомов.

3. Конкурс проводится в следующих номинациях:

- **"Традиционная книжная выставка" (**выставка по актуальным темам и проблемам: новых поступлений, персональная, жанровая, выставки к знаменательным и памятным датам, в помощь учебному процессу и т.д.);
- **"Нетрадиционная книжная выставка" (**отличаются оригинальностью подачи материала: выставка-дискуссия, выставка-сюрприз, выставка одной книги, выставка-викторина, выставка-игра, выставка-хобби, выставка-размышление и т.д.);
- **"Виртуальная выставка" (**выставка создается в программе Microsoft Office PowerPoint**).**

## III. Критерии оценки:

соответствие целевому и читательскому назначению;
соответствие заявленной темы и представленных материалов;
оригинальность и выразительность формулировки названия выставки;
полнота и последовательность раскрытия темы;
эстетическое оформление и дизайн;
использование художественно-иллюстративного материала;
использование предметного ряда;
наличие профессиональных находок, инновационных приемов, отступление от стереотипов;
рекламное сопровождение экспозиции;
эффективность выставки.

## IY. Подведение итогов и награждение победителей.

Подведение итогов состоится на совещании по подведению итогов работы за 1-е полугодие 2016 года.
Победители (1, 2, 3 места) в районном смотре-конкурсе награждаются почётными грамотами и призами.
Лучшие материалы будут опубликованы в информационно-аналитическом сборнике «Панорама библиотечной жизни».

# Постановление

Совета отдела идеологической работы, культуры
и по делам молодёжи Пинского райисполкома

**от 23.06. 2016 г.** **№ 6** **г. Пинск**

Об итогах проведения среди библиотек
Государственного учреждения культуры
“Пинская районная централизованная
библиотечная система” районного
смотра-конкурса “Библиотечная выставка –
средство рекламы книги и чтения”

Рассмотрев предложения оргкомитета по проведению районного смотра-конкурса “Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения”, Совет отдела идеологической работы, культуры и по делах молодёжи Пинского райисполкома постановляет:

Признать победителями районного смотра-конкурса с вручением грамот и призов:

- в номинации **“Традиционная книжная выставка”**

*Лемешевичскую СБ (библиотекарь Степанович Е. В.)*

в номинации **“Нетрадиционная книжная выставка”**

**1-е место:** *ЦРБ имени Е. Янищиц (отдел обслуживания и информации - зав. Данилович Т.И.)*

**2-е место:** *Логишинская ГпБ (зав. Гусина Л.И.)*

**3-е место:** *Поречская СБ (библиотекарь Бощук Г.А.)*

в номинации **“Виртуальная выставка”**

*Пинковичскую СБ (зав. Полюхович И.А., библиотекарь Балук О.Н.)*

2. За оригинальность подачи материала, творческий подход в оформлении книжной выставки, наградить грамотами:

- *Молотковичскую СБ (зав. Бойко Н. Е., библиотекарь Новак С. П.);*
- *Оховскую СБ (библиотекарь Кручко Н.П.).*

Председатель Совета,
начальник отдела
идеологической работы,
культуры и по делам молодёжи
Пинского райисполкома Л. В. Головач






Лемешевичская СБ

Пинковичская СБ




Молотковичская СБ






Логишинская ГпБ



Книжная выставка «Мир сказок» В Поречской СБ



Книжная выставка
«Сказочный калейдоскоп»
в Кошевичской СБ



Книжная выставка «Кулинарная мудрость»
в Оховской СБ



# Раённы агляд-конкурс
# на лепшы летапіс сваёй вёскі
# "Зямля, дзе пачаўся твой лёс"

**ПАСТАНОВА**
**Савета аддзела ідэалагічнай работы, культуры**
**і па справах моладзі Пінскага райвыканкама**

Ад 28. 07. 2016г. № 7

Аб правядзенні сярод бібліятэк
Дзяржаўнай установы культуры
“Пінская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма” раённага
агляду-конкурсу на лепшы летапіс
сваёй вёскі “Зямля, дзе пачаўся твой лёс”

З мэтай павышэння ролі бібліятэк у адраджэнні і захаванні гістарычнай і культурнай спадчыны, усебаковаму вывучэнню і даследаванню края, патрыятычнаму выхаванню жыхароў сваёй мясцовасці Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
**ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Раённы агляд-конкурс на лепшы летапіс сваёй вёскі “Зямля, дзе пачаўся твой лёс” правесці ў кастрычніку месяцы 2016 года.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб конкурсе, склад журы (дадаткі 1,2)

3. Аддзелу бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я. Янішчыц забяспечыць удзел усіх бібліятэк раёна ў аглядзе-конкурсе на лепшы летапіс сваёй вёскі “Зямля, дзе пачаўся твой лёс”.

4. Адказнасць за правядзенне раённага агляду-конкурсу сярод бібліятэк ускласці на дырэктара Дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” А.І. Анташук

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л.В. Галавач

ДАДАТАК №1
да Пастановы Савета аддзела
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад 28.07. 2016г.

## ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні сярод бібліятэк Дзяржаўнай установы культуры
"Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"
раённага агляду-конкурсу на лепшы летапіс сваёй вёскі
"Зямля, дзе пачаўся твой лёс"

### Асноўныя мэты і задачы конкурсу:

адраджэнне нацыянальнай, культурна-гістарычнай спадчыны краю;
захаванне і прымнажэнне нацыянальнага, духоўнага і культурнага здабытку Піншчыны;
выхаванне любові да роднага краю, да яе гісторыі і культуры, яе людзей;
пошук і збор матэрыялаў пра землякоў, ураджэнцаў краю, якія ў розныя гістарычныя перыяды ўнеслі значны ўклад у развіццё айчыннай гісторыі, культуры, літаратуры;
збор звестак аб падзеях, якія праславілі мясцовасць (вёску, раён);
ушанаванне аднавяскоўцаў-землякоў (таленавітых людзей працы, маці-гераіняў, вясковых народных талентаў, выдатных ураджэнцаў вёскі);
узмацненне ролі бібліятэк, як цэнтраў краязнаўчай інфармацыі;
